# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 26 сакавіка 1998 года, чацвер, № 5 (1778)

СУСТРЭЧЫ

## Адукацыйныя тэндэнцыі

На факультэце журналістыкі адбылася сустрэча з міністрам адукацыі Рэспублікі Беларусь Васілём Іванавічам Стражавым. Падчас сустрэчы была закранута праблема рэформы сярэднеадукацыйнай школы — гутарка ішла пра дванаццацігадовае навучанне. Высветлілася, што многія дзяўчаты хвалююцца за хлопцаў, якія будуць заканчваць школу ў 18 гадоў — а значыць, адразу трапяць у войска. Але Васіль Іванавіч падкрэсліў, што на момант канчатковага рэфармавання школы ў рэспубліцы, магчыма, будзе ўжо існаваць прафесійная армія і праблема вырашыцца сама сабой.

На сустрэчы было закранута дэмаграфічнае пытанне. Прысутныя даведаліся, што ў хуткім часе напоўненасць класаў знізіцца да 5-7 чалавек.

Што датычыць ВНУ, то Беларусь, як зазначыў міністр, стаіць не на апошнім месцы сярод іншых дзяржаў і ўзровень адукацыі ў нас — еўрапейскі.

Напрыканцы Васіль Іванавіч адзначыў, што беларускія рэктары маюць значна больш свабоды ў параўнанні з еўрапейскімі. Вось такая сучасная тэндэнцыя.

*Валерыя АЎСЯНІК*

ЗАПРАШЭННЕ

## "Інфарматыка-98"

З 14 па 16 красавіка ў галоўным корпусе Белдзяржуніверсітэта пройдзе штогадовы семінар "Інфарматыка-98". Арганізатары мерапрыемства — Цэнтр інфармацыйных тэхналогій, фонд праграмных сродкаў БДУ.

Жадаючыя будуць мець магчымасць наведаць выставу праграмнага забеспячэння і тэхнічных сродкаў, пазнаёміцца са спецыяльнай літаратурай і камп'ютэрнымі аксесуарамі, паслухаць даклады па разнастайнай тэматыцы:

- агляд і параўнаўчы аналіз сучаснай камп'ютэрнай тэхнікі;
- новыя інфармацыйныя тэхналогіі для прафесійных распрацоўшчыкаў прыкладнога праграмнага забеспячэння і карыстальнікаў;
- мультымедыйныя тэхналогіі ў адукацыі;
- тэхналогіі Internet;
- інтэграваныя аўтаматызаваныя сістэмы кіравання вытворчымі прадпрыемствамі і навучальнымі ўстановамі.

По больш падрабязную інфармацыю аб правядзенні семінара можна звяртацца па тэл.: (017) 226-58-95, факс: (017) 220-77-52

E-mail FPS CIT.BSU.UNIBEL.BY

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

## Географы-вандроўнікі

***На геаграфічным факультэце групай энтузіястаў адраджаюцца ўжо крыху забытыя традыцыі: ствараецца універсітэцкі турыстычны клуб. Больш падрабязна пра гэта расказаў студэнт I курса Вячаслаў Баран, які стаў ініцыятарам гэтай справы:***

— Сапраўды, географ — па натуры вандроўнік. Зразумела, яшчэ не час хадзіць у паходы. Але мы ўжо распрацоўваем дакументацыю, маршруты рознай катэгорыі складанасці. А з надыходам вясны думаем арганізаваць паход для ўсіх жадаючых. Акрамя таго, плануем правесці Дні геафака за горадам, а таксама здзейсніць шэраг кваліфікаваных паходаў.

Гэта неабходна для падрыхтоўкі сваіх інструктараў на далейшую працу.

Мы спадзяемся, што ў нас усё атрымаецца. Тым больш, адчуваецца падтрымка з боку рэктарата і БПСМ Белдзяржуніверсітэта.

А тым, каго зацікавіла ідэя турклуба, можна звяртацца да мяне (I курс, 3-я група) альбо перадаваць свае прапановы ў камітэт БПСМ БДУ (вул. Бабруйская, 7, п. 304, тэл. 268-70-98).

*Вадзім ЗУБРЫЦКІ, сакратар БПСМ геафака*

КОНКУРС

## Знак Студэнцкага Саюза

У сувязі з гадавінай стварэння Студэнцкага Саюза Белдзяржуніверсітэта праводзіцца конкурс "Знак Студэнцкага Саюза Белдзяржуніверсітэта".

Усе жадаючыя могуць прыняць у ім удзел, прадставіўшы свае эскізы да 15 красавіка 1998 года ва Упраўленне выхаваўчай работы з моладдзю (вул. Бабруйская, 7, каб. 304, тэл. 268-70-98). Для іх разгляду створана камісія на чале з прарэктарам па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях У. Б. Аджаевым.

Для ўзнагароды пераможцы конкурсу ўстаноўлена прэмія ў памеры пятнаццаці мінімальных заробкаў.

**Ліцэй Белдзяржуніверсітэта аб'яўляе конкурс:**

1. **на замяшчэнне пасад настаўнікаў англійскай мовы (8), беларускай мовы і літаратуры (3), інфарматыкі (2);**
2. **на замяшчэнне вакантнай пасады настаўніка інфарматыкі (1).**

*Тэрмін конкурсу — 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.*

**Адрас: г. Мінск, вул. Маякоўскага, 96, тэл. 221-04-10**

Праект

# Калектыўны дагавор паміж рэктаратам і прафкомам Беларускага дзяржаўнага універсітэта на 1998-2000 гг.

### I. Агульныя палажэнні

1.1. Дадзены Дагавор заключаны паміж рэктарам Беларускага дзяржаўнага універсітэта (у далейшым Рэктарат) і прафкомам Беларускага дзяржаўнага універсітэта (у далейшым Прафком) у адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь "Аб калектыўных дагаворах і пагадненнях", Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 15.07.95 г. № 278 "Аб развіцці сацыяльнага партнёрства ў Рэспубліцы Беларусь", Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 16.12.97 г. № 639 "Аб мерах па ўдасканальванню ўзаемадзеяння органаў дзяржаўнага кіравання і прафесіянальных саюзаў".

1.2. Рэктарат прызнае Прафком паўнамоцным прадстаўніком супрацоўнікаў універсітэта, якія з'яўляюцца членамі прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі, у калектыўных перагаворах.

1.3. Дагавор з'яўляецца нарматыўным актам, які канкрэтызуе агульныя прынцыпы сацыяльна-эканамічных адносін, накіраваны на забеспячэнне стабільнай і эфектыўнай дзейнасці навучальнай установы, на вырашэнне сацыяльна-працоўных і прафесійных праблем супрацоўнікаў універсітэта, грунтуецца на нормах, закладзеных у Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і іншых заканадаўчых і нарматыўных актах.

1.4. Дагавор пачынае дзейнічаць з дня яго падпісання да заключэння новага Дагавора, але не больш за 3 гады.

1.5. Дагавор распаўсюджваецца на наймальніка, работнікаў, з якімі заключаны працоўныя дагаворы (кантракты), якія знаходзяцца на прафабслугоўванні ў прафсаюзе работнікаў адукацыі і навукі, і мае для іх нарматыўна-абавязковую сілу.

1.6. Дагавор не перашкаджае ўстанаўленню дадатковых у параўнанні з дзеючым заканадаўствам ільгот і гарантый, якія ўводзяцца за кошт асабістых сродкаў працоўнага калектыву, мясцовага бюджэту, фундатараў і іншых крыніц рэсурснага забеспячэння.

1.7. Змяненні і дапаўненні ў Дагавор уносяцца са згоды бакоў па пісьмовай прапанове аднаго з бакоў у двухтыднёвы тэрмін з дня паступлення прапановы ў парадку, устаноўленым бакамі.

1.8. Абодва бакі прыйшлі да пагаднення:

1.8.1. Выкананне Дагавора па выніках паўгоддзя разглядаць на сумесным пасяджэнні Рэктарата і Прафкома са справаздачай службовых асоб, а па выніках года — на канферэнцыі працоўнага калектыву.

Кожны з бакоў забяспечвае магчымасць прысутнасці прадстаўнікоў другога боку з правам дарадчага голаса на пасяджэннях сваіх кіруючых органаў пры разглядзе пытанняў, якія ўваходзяць у састаў Дагавора, а таксама бакі забяспечваюць адзін аднаго неабходнымі матэрыяламі і дакументамі па гэтых пытаннях.

1.8.2. Прымаць неабходныя меры для вырашэння канфліктных сітуацый шляхам перамоў на падставе ўзаемнай павагі. У выпадку ўзнікнення калектыўных і працоўных спрэчак прад'яўленне патрабаванняў ажыццяўляецца ў парадку, прадугледжаным дзеючым заканадаўствам.

1.8.3. Разглядаць у двухтыднёвы тэрмін прадстаўленне аб недахопах у выкананні Дагавора і даваць матываваны адказ у пісьмовай форме.

1.9. Выкананне Дагавора кантралюецца Рэктарам і Прафкомам. Праверкі яго выканання праводзяцца не менш як 2 разы ў год са складаннем акта.

Рэктар і старшыня прафкома універсітэта робяць справаздачу аб выкананні Дагавора на канферэнцыі працоўнага калектыву.

1.10. Асобы, вінаватыя ў невыкананні (парушэнні) умоў Дагавора, могуць быць пазбаўлены прэміі часткова ці поўнасцю, на іх таксама можа быць накладзена дысцыплінарнае спагнанне.

Прадстаўленні аб накладанні дысцыплінарных спагнанняў на кіраўнікоў бакоў накіроўваюцца ў вышэйстаячыя органы ў парадку падначаленасці, якія павінны інфармаваць калектыў універсітэта аб прынятых мерах у месячны тэрмін.

1.11. Рэктарат і Прафком універсітэта даводзяць тэкст дадзенага Дагавора да падначаленых аддзелаў і службаў, прафсаюзных бюро і садзейнічаюць яго рэалізацыі на месцах.

1.12. Абмеркаванне калектыўнага Дагавора ажыццяўляецца на канферэнцыі працоўнага калектыву.

### II. Арганізацыя і аплата працы

2.1. Рэктарат абавязваецца:

2.1.1. Пры ўвядзенні новых умоў аплаты працы, унясенні змяненняў у існуючыя аператыўна даводзіць іх да ведама кіраўнікоў структурных падраздзяленняў, праводзіць семінары (нарады) па растлумачэнню іх зместу і парадку ўвядзення.

Забяспечыць магчымасць удзелу ў семінарах (нарадах) прадстаўнікоў Прафкома.

2.1.2. Своечасова праводзіць індэксацыю заработнай платы супрацоўнікаў універсітэта ў адпаведнасці з заканадаўствам.

2.1.3. Ажыццяўляць выдачу разліковых лісткоў па ўсіх відах заработнай платы.

2.2. Прафком абавязваецца:

2.2.1. Прымаць удзел у распрацоўцы праектаў дакументаў, якія датычацца ўмоў, арганізацыі і аплаты працы. Дамагацца выканання законных правоў і інтарэсаў супрацоўнікаў універсітэта.

2.2.2. Аператыўна даводзіць да ведама прафсаюзнага актыву кіруючыя дакументы, растлумачэнні, інструкцыйныя пісьмы, праводзіць семінары для прафсаюзнага актыву.

2.2.3. Кантраляваць своечасовасць і паўнату ўвядзення ў дзеянне пастаноў урада па пытаннях заработнай платы, арганізацыі і нарміраванню працы, інфармаваць Рэктарат аб выпадках парушэнняў тэрмінаў альбо парадку ўвядзення.

2.2.4. Згодна з дзеючым працоўным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь спаганяць, у выпадку неабходнасці, у судовым парадку з вінаватых асоб кампенсацыю за несвоечасова выплачаную заработную плату і адпускныя.

2.3. Рэктарат і Прафком абавязваюцца:

2.3.1. Аналізаваць паўнату фінансавання універсітэта, сацыяльна-эканамічнае становішча работнікаў. Паводле вынікаў аналізу ўносіць прапановы Савету Міністраў, Рэспубліканскаму камітэту прафсаюза.

2.3.2. Садзейнічаць выдзяленню з бюджэту універсітэта дадатковых сродкаў на фінансаванне мерапрыемстваў, прадугледжаных калектыўным Дагаворам па сацыяльнай абароне супрацоўнікаў універсітэта.

2.3.3. Прымаць меры для своечасовай выплаты заработнай платы і адпускных ва універсітэце.

2.4. Бакі прыйшлі да пагаднення:

2.4.1. Усе пытанні, якія датычацца нарміравання і аплаты працы, вырашаюцца Рэктаратам па ўзгадненні з Прафкомам.

2.4.2. Прэміраванне супрацоўнікаў універсітэта ажыццяўляецца згодна з Палажэннем аб прэміраванні. Палажэнне зацвярджаецца рэктарам і Прафкомам пасля яго адабрэння на канферэнцыі працоўнага калектыву і з'яўляецца неад'емнай часткай калектыўнага Дагавора універсітэта. Зэканомленыя па фонду заработнай платы сродкі падлічваюцца штомесячна і накіроўваюцца на матэрыяльнае стымуляванне супрацоўнікаў у адпаведнасці з калектыўным Дагаворам, які дзейнічае ва універсітэце.

2.4.3. Устанаўленне надбавак да ставак заработнай платы і службовых акладаў за высокія творчыя дасягненні ў працы, складанасць і напружанасць працы, выкананне асабліва важных (тэрміновых) работ на час іх правядзення і іншых, звязаных з умовамі працы, а таксама парадак аказання матэрыяльнай дапамогі і яе памеры рэгулююцца Палажэннямі, якія дадаюцца да Дагавора, пасля іх зацвярджэння рэктарам і Прафкомам.

2.4.4. Размеркаванне вучэбнай нагрузкі педагагічных работнікаў праводзіцца Рэктаратам па ўзгадненні з Прафкомам. Папярэдняе размеркаванне вучэбнай нагрузкі на наступны навучальны год ажыццяўляецца да пачатку летніх водпускаў.

2.4.5. Аб'ём вучэбнай нагрузкі ў разліку на выкладчыка ў кожным навучальным годзе ўстанаўліваць у адпаведнасці з рашэннем вучэбна-метадычнага савета універсітэта па гэтаму пытанню.

2.4.6. Дазволіць штатным супрацоўнікам універсітэта па рашэнні кафедраў дадатковае выкананне вучэбнай нагрузкі да 0,5 штатнай пасады і пагадзіннай — да 240.

*(Працяг на 2-й стар.)*

Праект

# Калектыўны дагавор паміж рэктаратам і прафкомам

(Пачатак на 1-й стар.)

2.4.7. Ажыццяўляць раўнамерную нагрузку выкладчыкаў па семестрах, не дапускаць правядзення двух экзаменаў у дзень адным выкладчыкам, больш 6 гадзін аўдыторных заняткаў па асноўнай рабоце, 9 гадзін з улікам сумяшчальніцтва ў дзень. Работу ў выхадныя дні дазваляць у выключных выпадках, афармляючы яе ў адпаведнасці з КЗаП РБ са згоды выкладчыка.

2.5. Абодва бакі прыйшлі да згоды:

2.5.1. Лічыць мэтазгоднымі ўсталяваныя кваліфікацыйныя патрабаванні да лабарантаў і тэхнікаў:

Вядучы лабарант з вышэйшай адукацыяй: вышэйшая спецыяльная адукацыя і стаж работы на пасадзе лабаранта I катэгорыі не менш 3 гадоў.

Лабарант I катэгорыі з вышэйшай адукацыяй: вышэйшая спецыяльная адукацыя і стаж работы на пасадзе лабаранта II катэгорыі не менш 3 гадоў.

Лабарант II катэгорыі з вышэйшай адукацыяй: вышэйшая адукацыя і стаж работы на пасадзе лабаранта без катэгорыі не менш 3 гадоў.

Лабарант без катэгорыі з вышэйшай адукацыяй: вышэйшая адукацыя без прад'яўлення патрабаванняў да стажу.

Лабарант I катэгорыі з сярэдняй адукацыяй: сярэднеспецыяльная адукацыя або 3 курсы ВНУ і стаж работы на пасадзе лабаранта II катэгорыі не менш 2 гадоў.

Лабарант II катэгорыі з сярэдняй адукацыяй: сярэдне-спецыяльная адукацыя або вучоба у ВНУ і стаж работы на пасадзе лабаранта без катэгорыі не менш 2 гадоў.

Лабарант без катэгорыі з сярэдняй адукацыяй: агульнасярэдняя адукацыя без прад'яўлення патрабавання да стажу.

Тэхнік I катэгорыі: сярэдне-спецыяльная адукацыя і стаж работы на пасадзе тэхніка II катэгорыі не менш 2 гадоў.

Тэхнік II катэгорыі: сярэдне-спецыяльная адукацыя і стаж работы на пасадзе тэхніка без катэгорыі не менш 1 года.

Тэхнік без катэгорыі: сярэдне-спецыяльная адукацыя, вучоба ў ВНУ па спецыяльнасці без прад'яўлення патрабаванняў да стажу работы.

2.5.2. Выплата заработнай платы штатным супрацоўнікам і сумяшчальнікам ажыццяўляецца ў 1998 годзе не радзей 2-х разоў у месяц:

— авансавыя выплаты з 18 па 21 дзень кожнага месяца;

— разлік за месяц з 3 па 5 дзень наступнага месяца.

## III. Прававое забеспячэнне працоўных адносін. Развіццё сацыяльнага партнёрства

3.1. Рэктарат абавязваецца:

3.1.1. Праводзіць семінары для кіраўнікоў структурных падраздзяленняў універсітэта ў кожным з семестраў па пытаннях працоўнага заканадаўства, па парадку заключэння калектыўнага дагавора і адказнасці за яго выкананне. Уключаць адпаведныя тэмы ў планы правядзення заняткаў з усімі супрацоўнікамі па прафесіянальнай падрыхтоўцы.

3.1.2. Аператыўна паведамляць усім кіраўнікам структурных падраздзяленняў і начальнікам службаў універсітэта аб змяненнях і дадатках, унесеных у заканадаўчыя акты аб працы, прафсаюзах, сацыяльным партнёрстве.

3.1.3. Паведамляць прафкому, прафгрупам не пазней за 2 тыдні аб выданні загадаў, інструкцый, службовых абавязкаў і іншых распараджэнняў рэктарата, якія датычацца працоўных і сацыяльна-эканамічных правоў супрацоўнікаў універсітэта.

3.1.4. Своечасова накіроўваць прафкому загады і іншыя дакументы рэктарата, якія датычацца ўмоў, арганізацыі, нарміравання, аховы і аплаты працы, сацыяльна-эканамічнага становішча супрацоўнікаў універсітэта.

3.2. Камітэт прафсаюза абавязваецца:

3.2.1. Удзельнічаць у нарадах, семінарах, сходах і іншых мерапрыемствах, якія праводзіць адміністрацыя універсітэта.

3.2.2. Ажыццяўляць бясплатнае кансультаванне супрацоўнікаў універсітэта па пытаннях заканадаўства аб працы і інш.

3.2.3. Садзейнічаць адміністрацыі універсітэта ў мерапрыемствах, накіраваных на павышэнне плённай працы ва універсітэце, паляпшэнне ўмоў працы супрацоўнікаў.

3.2.4. Усе спрэчныя пытанні вырашаць з адміністрацыяй на дабрачыннай аснове.

3.3. Абодва бакі прыйшлі да згоды:

3.3.1. Забяспечваць магчымасць удзельнічаць у семінарах, нарадах, сходах і іншых мерапрыемствах, якія праводзяцца бакамі і датычацца сацыяльна-эканамічных і прафесіянальных інтарэсаў супрацоўнікаў універсітэта, прадстаўнікі другога боку ўдзельнічаюць з правам дарадчага голасу.

3.3.2. Загады па пытаннях змянення аплаты працы, ахове працы, працоўных і сацыяльна-эканамічных правах супрацоўнікаў універсітэта, выдаюцца і прымаюцца рэктарам пры згодзе Прафкома.

3.3.3. Жанчыне, якая выхоўвае дваіх і больш дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў, па яе асабістай заяве кожны месяц даецца адзін дзень па догляду за дзецьмі з захаваннем сярэднемесячнага заробку.

3.3.4. Жанчынам, якія маюць дзіця ва ўзросце да 16 гадоў, па іх асабістай заяве можа прадстаўляцца адзін дзень у месяц па догляду за дзіцём без захавання заробку.

3.3.5. Па пісьмовай заяве супрацоўніка яму можа быць прадастаўлены водпуск без захавання заробку па сямейных абставінах і іншых прычынах да аднаго каляндарнага месяца ў бягучым каляндарным годзе.

3.3.6. Захаваць у адпаведнасці з дзеючым палажэннем для прафесарска-выкладчыцкага саставу конкурсны парадак замяшчэння пасад незалежна ад узросту. Дазволіць адміністрацыі заключаць кантракты з асобамі пенсійнага толькі пасля заканчэння тэрміну выбрання на пасаду.

3.3.7. Дазволіць Рэктарату ажыццяўляць часовы перавод работніка, з яго згоды, на тэрмін да аднаго месяца ў летнія канікулы:

— на рабочыя пасады гардэробшчыкаў, прыбіральшчыц, ліфцёраў, вартаўнікоў;

— на адпаведныя пасады служачых, лабарантаў, інжынераў, тэхнікаў — з ліку вучэбна-дапаможнага саставу;

— выкладчыкам, свабодным ад правядзення заняткаў, даручыць выконваць арганізацыйную і выхаваўчую работу пры правядзенні ўступных экзаменаў, работу з замежнымі студэнтамі і на сельскагаспадарчых работах.

3.3.8. Дазволіць рэктару, акрамя конкурснага замяшчэння пасад выкладчыкаў, заключаць працоўны дагавор па загаду з маладымі спецыялістамі, выпускнікамі аспірантуры і высокакваліфікаванымі спецыялістамі, у якіх няма педагагічнага вопыту, таксама па загаду заключаць працоўны дагавор з выкладчыкамі, што дасягнулі пенсійнага ўзросту і ў якіх скончыўся тэрмін выбрання — тэрмінам на адзін навучальны год і ў далейшым, пры неабходнасці, з перазаключэннем дагавору.

3.3.9. Для прафесарска-выкладчыцкага саставу (ПВС) устанаўліваецца шасцігадзінны рабочы дзень, у межах якога выкладчыкі павінны весці ўсе віды вучэбнай, вучэбна-метадычнай і навукова-даследчай работы.

3.3.10. Для служачых і рабочых, якія непасрэдна не ўдзельнічаюць у вучэбным працэсе, устанаўліваецца 5-дзённы працоўны тыдзень з 8-гадзінным працоўным днём.

3.3.11. Кожны кіраўнік структурнага падраздзялення арганізоўвае ўлік працоўнага часу падначаленых. Да пачатку працы кожны супрацоўнік (акрамя ПВС) павінен адзначыць свае прыбыццё, а па заканчэнні — час адыходу з працоўнага месца.

3.3.12. Забяспечыць умовы павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў і супрацоўнікаў па асноўных спецыяльнасцях: вылічальнай тэхніцы, вывучэнню беларускай і замежных моў, згодна планам падраздзяленняў.

3.3.13. Супрацоўнікі універсітэта абавязуюцца захоўваць дысцыпліну, дамагацца выканання гэтага патрабавання ад студэнтаў.

3.3.14. Ва універсітэце прымяняюцца наступныя заахвочванні:

рэктарам па ўзгадненні з Прафкомам:

- узнагарода каштоўнымі падарункамі;
- выдача грашовай прэміі;
- аб'яўленне падзякі і выдача грашовай прэміі;
- узнагароджанне Ганаровай граматай і выдача грашовай прэміі.

Рэктарам сумесна з Прафкомам:

- прадстаўленне да ўзнагароды Міністэрства адукацыі;
- прадстаўленне да ўзнагарод урада і Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь, Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

3.3.15. Да памеру выхадной дапамогі, замацаванай у артыкуле 36 КЗаП РБ, дадаецца:

Артыкул 29 п.3 — прызыў або паступленне на ваенную службу, выплачваецца дапамога ў памеры месячнага акладу;

Артыкул 33 п.1 — пры звальненні на пенсію тых, хто працаваў у нашай навуковай установе:

- менш 10 гадоў, дапамога выдаецца ў памеры двухтыднёвага заробку;
- ад 10 да 20 гадоў — 1 месячны аклад;
- звыш 20 гадоў — 2 месячныя аклады.

3.3.16. Не радзей аднаго разу ў год праводзіць сумесныя праверкі выканання заканадаўства аб працы ва універсітэце з наступным разглядам вынікаў на сумесным пасяджэнні Рэктарата і Прафкома.

## IV. Гарантыі занятасці

4.1. Рэктарат абавязваецца:

4.1.1. Прымаць неабходныя меры па недапушчэнню, калі на гэта не будзе абгрунтаваных прычын, звальнення супрацоўнікаў па скарачэнню штатаў, а калі наступіць пэўная патрэба, прымаць усе неабходныя меры па працаўладкаванню тых, хто падпадае пад звальненне.

4.1.2. Уведамляць Прафком не пазней чым за тры месяцы аб маючай адбыцца ліквідацыі ці рэарганізацыі структурных падраздзяленняў універсітэта, поўным ці частковым прыпыненні работы, калі гэта пацягне за сабой скарачэнне рабочых месцаў ці пагаршэнне ўмоў працы. Праводзіць з Прафкомам перагаворы па захаванні правоў і законных інтарэсаў супрацоўнікаў, якія вызваляюцца.

4.2. Прафком абавязваецца:

4.2.1. Ажыццяўляць кантроль за выкананнем заканадаўства аб занятасці з прадстаўленнем вызваленым супрацоўнікам ільгот і кампенсацый.

4.2.2. Не здымаць з прафсаюзнага ўліку вызваленых супрацоўнікаў да таго часу пакуль яны не працаўладкуюцца.

4.2.3. Ахоўваць працоўныя правы работнікаў — членаў прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі пры заключэнні або скасаванні працоўных дагавораў (кантрактаў).

4.3. Абодва бакі прыйшлі да згоды:

4.3.1. Скасаванне працоўнага дагавора па ініцыятыве наймальніка па пунктах 1, 2, 3, 4, 5 артыкула 33, пункта 2 артыкула 254 КЗаП Рэспублікі Беларусь праводзіцца з папярэдняй згоды Прафкома, па пунктах 6, 7, 8 артыкула 33, пункта 3 артыкула 254 КЗаП Рэспублікі Беларусь — пасля папярэдняга, не пазней чым за два тыдні, паведамлення ў Прафком.

4.3.2. Пры скарачэнні колькасці або штату супрацоўнікаў разам з пераважным правам застацца на працы, у выпадку роўнай прадукцыйнасці і кваліфікацыі (акрамя катэгорый, адзначаных у артыкулах 34, 238 КЗаП РБ і іншых заканадаўчых актах), перавага аддаецца супрацоўнікам:

- адзіным у сям'і кармільцам;
- супрацоўнікам, якія атрымалі пашкоджанне здароўя ва універсітэце;
- маючым больш працяглы стаж працы ва універсітэце;
- маючых 3-х і больш дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў;
- моладзі ва ўзросце да 18 гадоў;
- супрацоўнікам перадпенсійнага ўзросту (за 2 гады);
- воінам-інтэрнацыяналістам, удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны і прыраўнаваным да іх асобам.

4.3.3. Пры недастатковым фінансаванні аплаты працы ў падраздзяленнях навукова-даследчай часткі прадастаўіць адміністрацыі права пераводзіць супрацоўнікаў па іх асабістай заяве на няпоўны рабочы дзень, на няпоўны рабочы тыдзень, з зарплатай прапарцыянальна адпрацаванаму часу ці прадастаўляць ім адпачынак (неаплочваемы) тэрмінам да 3 месяцаў.

4.3.4. Даплаты спецыялістам і служачым могуць устанаўлівацца за сумяшчэнне абавязкаў супрацоўніка, які часова адсутнічае (хвароба, дэкрэтны водпуск па догляду за дзіцём да 3-х гадоў, працяглая камандзіроўка) і па рабочых пасадах з аплатай да 100%.

4.3.5. Запаўненне вакантных пасад уборшчыкаў, дворнікаў, гардэробшчыц можа праводзіцца па сумяшчальніцтву на поўную стаўку.

4.3.6. Жанчынам, якія маюць дзяцей ва ўзросце ад 3 да 6 год, прадстаўляць па іх заяве дадатковы неаплочваемы водпуск па догляду за дзіцём з захаваннем месца работы (пасады).

## V. Абарона працы і навакольнага асяроддзя

5.1. Рэктарат абавязваецца:

5.1.1. Кожны год падводзіць вынікі работы універсітэта па паляпшэнню ўмоў аховы працы і прафілактыкі траўматызму і іншых няшчасных выпадкаў.

5.1.2. Ажыццяўляць пастаянны кантроль за станам аховы працы, выкананнем правілаў тэхнікі бяспекі ў падраздзяленнях універсітэта, прымаць меры па ўдасканаленню гэтай работы.

5.1.3. З мэтай папярэджання і высвятлення прафесійных захворванняў і выпадкаў сістэматычна (не менш 1 разу ў год) арганізоўваць правядзенне медыцынскіх аглядаў.

5.1.4. Своечасова забяспечваць супрацоўнікаў, занятых на работах са шкоднымі ўмовамі, індывідуальнымі сродкамі аховы, мыйнымі і іншымі сродкамі, якія вызначаны дзеючымі нормамі і правіламі.

5.1.5. Даваць вызначаным дзеючым заканадаўствам катэгорыям работнікаў, занятым на работах са шкоднымі ўмовамі працы, дадатковы адпачынак, а таксама лячэбна-прафілактычнае харчаванне.

5.1.6. Выплачваць супрацоўнікам у якасці аднаразовай кампенсацыі сярэднямесячны заробак за кожны працэнт страты працаздольнасці, што наступіла ў выніку прафесійнага захворвання альбо няшчаснага выпадку пры выкананні імі службовых абавязкаў.

5.1.7. Ажыццяўляць работы па падтрыманню нармальнага стану карпусоў і інтэрнатаў на ўвесь навучальны тэрмін.

5.2. Прафком абавязваецца:

5.2.1. Ажыццяўляць грамадскі кантроль за станам аховы працы ў падраздзяленнях універсітэта, дабівацца для супрацоўнікаў неабходных ільгот і кампенсацый.

5.2.2. Абараняць інтарэсы і законныя правы супрацоўнікаў на здаровыя і бяспечныя ўмовы працы, матэрыяльныя інтарэсы пацярпелых у выніку няшчаснага выпадку альбо страціўшых працаздольнасць з-за прафесійнага захворвання пры выкананні прафесійных абавязкаў, членаў іх сем'яў.

5.2.3. Аналізаваць стан траўматызму і ўзровень прафесійных захворванняў, паўнату прадстаўлення прадугледжаных заканадаўствам ільгот і кампенсацый за работу ў неспрыяльных умовах працы.

5.3. Абодва бакі прыйшлі да згоды:

5.3.1. Упаўнаважаныя прадстаўнікі Прафкома ва ўстаноўленым парадку ажыццяўляюць ва ўсіх падраздзяленнях універсітэта грамадскі кантроль за выкананнем заканадаўства аб працы, нормаў правіл па ахове працы. Вынікі праводзімых праверак даводзяцца да ведама рэктара універсітэта.

## VI. Арганізацыя адпачынку і санаторна-курортнага лячэння

6.1. Рэктарат абавязваецца:

6.1.1. Садзейнічаць арганізацыі адпачынку, санаторна-курортнага лячэння работнікаў, арганізацыі дадатковых медыцынскіх аглядаў работнікаў, звязаных з небяспечнымі і шкоднымі ўмовамі працы.

6.1.2. Забяспечыць супрацоўнікаў універсітэта ільготнымі пуцёўкамі ў санаторыі, дамы адпачынку, пансіянаты. Набываць дадатковыя пуцёўкі на лячэнне і адпачынак за кошт фонду сацыяльнага развіцця універсітэта.

6.1.3. Арганізаваць правядзенне адпачынку выкладчыкаў і супрацоўнікаў шляхам прадстаўлення пуцёвак на:

- санаторна-курортнае лячэнне;
- адпачынак дзяцей супрацоўнікаў у дзіцячых лагерах.

6.1.4. Забяспечыць выкарыстанне спартыўных і культурна-бытавых памяшканняў у вольны ад вучэбных заняткаў час для мэтаў аздараўлення выкладчыкаў і супрацоўнікаў.

6.1.5. Адлічваць не менш 0,15% ад фонду аплаты працы на разліковы рахунак Прафкома для правядзення культурна-масавых і спартыўных мерапрыемстваў, прапаганды здаровага ладу жыцця і адраджэння нацыянальнай культуры.

6.2. Прафком абавязваецца:

6.2.1.Забяспечыць фінансаванне груп здароўя ў адпаведнасці з каштарысам прафкама.

6.2.2. Арганізаваць цэнтралізаванае забеспячэнне білетамі на канцэрты, у кіно і тэатры.

6.2.3. Садзейнічаць арганізацыі культурнага адпачынку і ахове здароўя выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта.

6.3. Бакі прыйшлі да згоды:

6.3.1. Прадастаўляць для работнікаў у бясплатнае карыстанне памяшканні для заняткаў калектываў мастацкай самадзейнасці, аматарскіх аб'яднанняў і клубаў па інтарэсах, спартыўных секцый і гурткоў (пры іх адсутнасці аплачваць арэнду).

6.3.2. Пры прадстаўленні работніку пуцёўкі на санаторна-курортнае лячэнне на працягу навучальнага года ў перыяд, які не супадае са штогадовым водпускам, яму прадстаўляецца водпуск за кошт чарговага, а ў выпадку яго выкарыстання — водпуск без захавання заработнай платы.

6.3.3. Практыкаваць арганізацыю экскурсій супрацоўнікаў па роднаму краю з частковай аплатай.

6.3.4. Садзейнічаць маральна і матэрыяльна развіццю мастацкай самадзейнай творчасці супрацоўнікаў універсітэта.

6.3.5. Уключаць у склад камиісій універсітэта па аздараўленню і санаторна-курортнаму лячэнню супрацоўнікаў і студэнтаў прадстаўнікоў прафсаюзных камітэтаў супрацоўнікаў і студэнтаў.

6.3.6. Арганізаваць у санаторыях-прафілакторыях аздараўленне маці і дзіцяці ў летні час.

6.3.7. 1 млрд. рублёў ад пазабюджэтных сродкаў накіроўваць для вырашэння сацыяльных пытанняў супрацоўнікаў універсітэта і іх сем'яў.

(Працяг на 3-й стар.)

# Беларускага дзяржаўнага універсітэта на 1998-2000 гг.

(Пачатак на 1-2 стар.)

### VII. Паляпшэнне жыллёва-бытавых умоў, гандлёвага абслугоўвання і харчавання супрацоўнікаў

7.1. Абодва бакі абавязваюцца дамагацца:

7.1.1. Ільготных крэдытаў для будаўніцтва жылля супрацоўнікам універсітэта.

7.1.2. Выдзялення з бюджэту сродкаў на сацыяльнае развіццё калектыву універсітэта, аказанне матэрыяльнай дапамогі маючым патрэбу.

7.1.3. Фінансавага забеспячэння калектыўнага дагавора.

7.1.4. Стварэння ва універсітэце ў каштарысе фонду вытворчага і сацыяльнага артыкула для аказання падтрымкі маючым вострую патрэбу.

7.1.5. Забеспячэння ў пунктах грамадскага харчавання наяўнасці ў меню дыетычных страў.

7.2. Абодва бакі прыйшлі да пагаднення:

7.2.1. Ажыццяўляць рэгулярны кантроль за работай пунктаў грамадскага харчавання з мэтай забеспячэння належных санаторных умоў, высокай якасці гатаванай ежы і высокай культуры абслугоўвання.

7.2.2. Адміністрацыя і прафком універсітэта абавязваюцца выканаць у 1998 годзе ўсю неабходную работу дзеля пачатку будаўніцтва на платнай аснове дома.

7.2.3. Прадстаўленне жылой плошчы пры ўмове выдзялення ажыццяўляць у адпаведнасці са спісам чаргі на атрыманне жылля і ільготным спісам супрацоўнікаў.

7.2.4. Пастаноўку на ўлік у чаргу для забеспячэння жылой плошчай ажыццяўляць сумесным рашэннем рэктара і прафкама ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам і нарматыўнымі дакументамі.

7.2.5. Прызнаць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў супрацоўнікаў, якія адпрацавалі ва універсітэце больш 20 гадоў, маюць высокія дасягненні ў працы і менш 8 кв. м на кожнага члена сям'і.

### VIII. Прававыя гарантыі дзейнасці прафкома і яго прафактыву

8.1. Рэктарат абавязваецца:

8.1.1. Даваць прафкому інфармацыю, якая неабходна для вядзення калектыўных перагавораў і рэалізацыі правоў прафсаюза па абароне працоўных і сацыяльна-эканамічных інтарэсаў супрацоўнікаў.

8.2. Прафком абавязваецца:

8.2.1. Праводзіць навучанне прафактыву па пытаннях працоўнага заканадаўства, аховы працы, сацыяльнага страхавання, заработнай платы.

8.3. Абодва бакі прыйшлі да пагаднення:

8.3.1. Прафсаюзныя актывісты — члены абраных прафсаюзных органаў вызваляюцца ад асноўнай працы для ўдзелу ў рабоце з'ездаў, канферэнцый, пленумаў і іншых статутных мерапрыемстваў, а таксама кароткатэрміновай прафсаюзнай вучобы з захаваннем сярэдняга заробку. Ім даецца свабодны час для выканання грамадскіх абавязкаў на карысць калектыву.

8.3.2. Абраным прафсаюзным работнікам пасля заканчэння іх паўнамоцтва на выбарнай пасадзе даецца магчымасць працаваць на папярэднім месцы працы (пасадзе), а пры яе адсутнасці са згоды работніка прапануецца другая раўназначная работа (пасада).

8.3.3. Захоўваецца існуючы парадак платы прафсаюзных узносаў шляхам пералічэння праз бухгалтэрыю універсітэта.

8.3.4. Наймальнікам забяспечваюцца матэрыяльныя ўмовы для дзейнасці Прафкома (прадстаўленне памяшкання без аплаты, аргтэхнікі, канцтавараў, паперы, сродкаў сувязі і г.д.).

8.3.5. Звальненне па ініцыятыве наймальніка, а таксама прыцягненне да дысцыплінарнай адказнасці асоб, абраных у склад Прафкома універсітэта, прафсаюзных бюро і прафгруп і не вызваленых ад вытворчай працы, дазваляецца з папярэдняй згоды Прафкома універсітэта.

8.3.6. Звальненне па ініцыятыве наймальніка асоб, абраных у склад абласнога, Рэспубліканскага камітэта прафсаюза і не вызваленых ад вытворчай працы, дазваляецца, акрамя захоўвання агульнага парадку звальнення, з пісьмовага папярэдняга паведамлення ў абмежаваны тэрмін у прафсаюзны орган, членам якога яны абраны.

8.3.7. Вызваленыя прафсаюзныя работнікі з'яўляюцца раўнапраўнымі членамі працоўнага калектыву універсітэта і карыстаюцца ўсімі правамі і ільготамі нароўні з імі.

### IX. Захаванне інтарэсаў работнікаў пры пераходзе да рыначнай эканомікі

9.1. Абодва бакі прыйшлі да пагаднення:

9.1.1. Пры змяненні формаў уласнасці і гаспадарання, стварэнні (заснаванні) дачэрніх, сумесных, іншых прадпрыемстваў, фірмаў, кааператываў, дзе задзейнічаны асноўныя фонды і сродкі універсітэта, праводзяцца папярэднія перагаворы з Прафкомам з мэтай дасягнення агульнай згоды па пытаннях, якія закранаюць сацыяльна-эканамічныя інтарэсы калектыву.

9.1.2. Перадача, здача ў арэнду маёмасці, якая належыць універсітэту, праводзіцца ў адпаведнасці з заканадаўствам РБ з улікам меркавання Прафкома.

9.2. Прафком абавязваецца:

9.2.1. Прымаць удзел у абмеркаванні праблем прыватызацыі ва універсітэце, яе мэтазгоднасці, адстойваць пры гэтым інтарэсы супрацоўнікаў.

9.2.2. Уносіць прапановы, якія забяспечваюць сацыяльна-эканамічныя і прававыя гарантыі работнікам пры змяненні формаў уласнасці.

9.2.3. Ажыццяўляць грамадскі кантроль за правядзеннем прыватызацыі, не дапускаць прыняцця неабгрунтаваных рашэнняў і прымусовай прыватызацыі.

---

Праект

# Палажэнне аб матэрыяльным стымуляванні працы работнікаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта

### I. Агульныя палажэнні

1. Палажэнне аб прэміраванні і ўстанаўленні надбавак да службовых акладаў работнікам Белдзяржуніверсітэта ўводзіцца ў мэтах матэрыяльнай зацікаўленасці іх у павышэнні эфектыўнасці працы, удасканаленні і дыферэнцыяцыі матэрыяльнага стымулявання.

2. Палажэнне распрацавана ў адпаведнасці з Кодэксам Законаў аб працы Рэспублікі Беларусь (артыкулы 77, 83, 84, 85, 131) і Пастановамі Савета Міністраў і Міністэрства працы Рэспублікі Беларусь, якія рэгламентуюць пытанні матэрыяльнага стымулявання працы работнікаў вышэйшых навучальных установаў.

3. Адлічэнні сродкаў на прэміраванне і ўстанаўленне надбавак адбываецца ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 477 ад 20.10.96 г.

4. Крыніцамі сродкаў, якія накіроўваюцца на матэрыяльнае стымуляванне работнікаў БДУ, з'яўляюцца:

а) дзяржаўныя сродкі ў памеры 50% фонду заработнай платы;

б) эканомія фонду аплаты працы;

в) сродкі ад пазабюджэтнай дзейнасці.

5. Надбаўкі да службовых акладаў кіраўнікам структурных падраздзяленняў, спецыялістам і служачым і прэміі працуючым улічваюцца пры вылічэнні сярэдняга заробку ў выпадках і ў парадку, прадугледжаным дзеючым заканадаўствам.

6. Палажэнне аб матэрыяльным стымуляванні зацвярджаецца рэктарам БДУ па ўзгадненню з прафсаюзным камітэтам.

7. Палажэнне аб матэрыяльным стымуляванні распаўсюджваецца на штатных кіраўнікоў структурных падраздзяленняў, спецыялістаў, служачых і сумяшчальнікаў (апрача работнікаў навукова-даследчых падраздзяленняў і ўстаноў), якія ўтрымліваюцца за кошт сродкаў дзяржаўнага бюджэту і за кошт сродкаў ад пазабюджэтнай дзейнасці.

### II. Парадак і ўмовы ўстанаўлення надбавак да службовых акладаў работнікаў Белдзяржуніверсітэта

1. Работнікам установаў устанаўліваюцца наступныя віды надбавак да службовых акладаў:

а) кіраўнікам, спецыялістам і служачым:

- за творчыя дасягненні ў рабоце, якія патрабавалі рашэння прынцыпова новых задач, прымянення нетрадыцыйных наватарскіх падыходаў, формаў і метадаў работы;

- за актыўную работу, якая вызначыла перспектыву развіцця універсітэта;

- за вытворчыя дасягненні, якія забяспечылі ўстойлівае функцыянаванне і развіццё ВНУ, яго структурных падраздзяленняў, якасць і аператыўнасць выканання службовых абавязкаў, ажыццяўленне падрыхтоўкі спецыялістаў у адпаведнасці з прад'яўленымі дзяржавай патрабаваннямі;

- за плённую падрыхтоўку кандыдатаў і дактароў навук пры паспяховым заканчэнні аспірантуры, за арганізацыю павышэння прафесійнай кваліфікацыі кадраў;

- за работу па навукова-метадычнаму забеспячэнню навучальнага працэса, распрацоўку вучэбных і метадычных дапаможнікаў, за ўдзел у камп'ютэрызацыі, укараненне новай тэхнікі ў навучальны працэс;

- за абнаўленне і развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы універсітэта, забеспячэнне цэласці матэрыяльных каштоўнасцей, эканомію электра- і цеплаэнергіі, паляпшэнне ўмоў працы супрацоўнікаў, аспірантаў і студэнтаў універсітэта;

- за выкананне асабліва важных (тэрміновых) работ, не прадугледжаных службовымі абавязкамі супрацоўнікаў на перыяд выканання, але не больш бягучага года, пазапланавых надзвычайных работ па выкананню тэрміновых даручэнняў кіраўніцтва універсітэта, што патрабавала ад выканаўцаў высокага прафесійнага майстэрства і асаблівых творчых намаганняў, дадатковых затрат часу і павышанай інтэнсіўнасці працы на перыяд іх выканання;

б) рабочым:

- за прафесійнае майстэрства (у мэтах стымулявання прафмайстэрства і ўзмацнення матэрыяльнай зацікаўленасці і адказнасці за выкананне даручанай работы).

2. Памер надбавак у працэнтах да службовых акладаў супрацоўнікаў БДУ устанаўліваецца загадам рэктара на квартал, па прадстаўленню прарэктараў і кіраўнікоў структурных падраздзяленняў. Выплата адбываецца штомесячна, зыходзячы з вызначаных памераў. Надбаўкі некаторым асобам канкрэтнымі памерамі не абмяжоўваюцца, але не павінны перавышаць 100% памеру службовага аклада.

3. Пасля сканчэння вызначаных загадам тэрмінаў выплата надбавак работнікам спыняецца.

4. Пры перарасходзе сродкаў, прадугледжаных на аплату працы, надбаўкі адмяняюцца.

5. Надбаўкі не налічваюцца за перыяды:

- чарговага водпуска;

- часовай непрацаздольнасці;

- выпрабаваўчага тэрміну;

- водпуска без захавання заработнай платы;

- водпуска па догляду за дзіцём;

- знаходжання на курсах павышэння кваліфікацыі і іншыя перыяды, калі за работнікам у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам захоўваецца сярэдняя заработная плата.

6. Надбаўкі работнікам за незахаванне тэрмінаў ці зніжэнне якасці выканання даручанай работы, пры парушэнні працоўнай і вытворчай дысцыпліны адмяняюцца ці змяншаецца іх памер.

### III. Парадак і ўмовы прэміравання работнікаў Белдзяржуніверсітэта

Паказчыкі:

1. Прэміраванне работнікаў адбываецца за:

а) высокую якасць і эфектыўнасць выкананых работ;

б) выкананне даручанай работы датэрмінова і якасна;

в) эканомію матэрыяльных і энергетычных рэсурсаў;

г) збор і здачу лома і адходаў чорных, каляровых і каштоўных металаў;

д) садзеянне ўводу ў дзеянне аб'ектаў будаўніцтва;

е) укараненне ў практыку новых формаў і метадаў арганізацыі працы;

ж) абнаўленне матэрыяльна-тэхнічнай базы і забеспячэнне цэласці матэрыяльных каштоўнасцей;

з) работу па навукова-метадчнаму забеспячэнню навучальнага працэса, распрацоўцы вучэбных і метадычных дапаможнікаў і г.д.

2. Паказчыкі прэміравання для асобных структурных падраздзяленняў і асобных катэгорый работнікаў вызначаюцца кіраўнікамі.

3. Прэміраванню падлягаюць:

- кіраўнічы персанал (рэктар, прарэктары, кіраўнікі структурных падраздзяленняў);

- прафесарска-выкладчыцкі састаў;

- вучэбна-дапаможны і інжынерна-тэхнічны персанал;

- гаспадарча-абслугоўваючы персанал і рабочыя.

4. Вылучэнне на прэміраванне кіраўнікоў цэнтраў, упраўленняў, аддзелаў і іншых структурных падраздзяленняў, дэканаў факультэтаў і загадчыкаў агульнауніверсітэцкіх кафедраў — па рашэнню прарэктараў-кураратараў, а прарэктараў — рэктарам па ўзгадненню з прафсаюзным камітэтам Белдзяржуніверсітэта.

5. Загадчыкі кафедраў, намеснікі дэканаў, выкладчыкі і супрацоўнікі факультэтаў прадстаўляюцца да прэміравання дэканамі факультэтаў па ўзгадненню з прафсаюзным бюро.

6. Рашэнне аб прадстаўленні да прэміравання работнікаў цэнтраў, упраўленняў, аддзелаў і іншых службаў прымаюць кіраўнікі гэтых структурных падраздзяленняў сумесна з прафсаюзным бюро.

Прэміраванне рэктара адбываецца за месячныя вынікі працы ў парадку і памерах, прадугледжаных для кіраўніцтва універсітэта. Пры наяўнасці заўваг Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь па выніках працы за справаздачны перыяд, прадстаўленых да 15 дня месяца, наступнага за справаздачным, рэктар пазбаўляецца прэміі часткова ці поўнасцю. Пры адсутнасці заўваг і прапаноў рэктар універсітэта прэміруецца ў памеры, прадугледжаным для кіраўніцтва БДУ.

7. Прэміраванне адбываецца штомесячна на падставе загада рэктара. Супрацоўнікі, якія працавалі не поўны месяц (прынятыя на працу ў сярэдзіне месяца ці звoленыя па ўласнаму жаданню, не адпрацаваўшы поўны месяц), прэміраванню не падлягаюць.

8. Прэміраванне адбываецца за вынікі работы мінулага месяца.

9. Памер прэміі кожнаму работніку вызначаецца ў межах выдзеленай сумы прэміяльных сродкаў на падраздзяленне і дыферэнцыруецца з улікам асабістага ўкладу.

10. Прэміі канкрэтным работнікам з улікам аб'ёмаў і якасці выкананых работ максімальнымі памерамі не абмяжоўваюцца. Ураўнілаўка пры прэміраванні супрацоўнікаў не дапускаецца.

11. Па выніках навучальнага і каляндарнага года прэміраванне супрацоўнікаў адбываецца па выніках іх працы ў справаздачным перыядзе з улікам фактычна адпрацаванага часу.

12. Работнікі Белдзяржуніверсітэта могуць быць:

а) пазбаўлены прэміі часткова за:

- нядобрасумленнае выкананне функцыянальных абавязкаў, пацверджанае вынікамі праверак, кантролю;

- парушэнне правіл унутранага працоўнага распарадку, Статута і іншых дакументаў, якія рэгламентуюць дзейнасць універсітэта;

- парушэнне правіл аховы і тэхнікі бяспекі;

- невыкананне ў тэрмін абавязкаў па калектыўнаму дагавору;

- іншыя парушэнні, прадугледжаныя ў Палажэнні аб матэрыяльным стымуляванні работнікаў;

б) пазбаўлены прэміі поўнасцю:

- прагул без уважлівай прычыны;

- атрыманне вымовы, строгай вымовы;

- з'яўленне на працы ў нецвярозым стане;

- невыкананне абавязкаў па калектыўнаму дагавору;

- невыкананне функцыянальных абавязкаў, пацверджанае вынікамі праверак, кантролю;

- грубае парушэнне аховы працы і тэхнікі бяспекі;

- грубае парушэнне інструкцый і іншых заканадаўчых дакументаў;

- іншыя парушэнні, прадугледжаныя ў Палажэнні аб матэрыяльным стымуляванні працы работнікаў.

13. Работнікам, зволеным па ініцыятыве кіраўніцтва, прэмія не выплачваецца.

14. Змяншэнне памеру ці пазбаўленне прэміі таксама афармляецца загадам рэктара БДУ з абавязковым указаннем прычын.

15. Прэміраванне сумяшчальнікаў, якія працуюць ва універсітэце, адбываецца паводле гэтага Палажэння.

16. Гэтае Палажэнне дзейнічае да ўвядзення новых умоў аплаты працы работнікаў, устанаўлення надбавак, даплат і іншых выплат стымулюючага характару, зацверджаных Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, і можа па неабходнасці ўдакладняцца.

---

Праект

## Палажэнне аб парадку выкарыстання каштарысу ФМД БДУ на аднаразовую дапамогу

1. Сродкі, якія выдзяляюцца на аднаразовую дапамогу, выдаткоўваюцца ў сувязі:

| №№ пп | Падстава | Памер аднаразовай дапамогі (не менш) |
|---|---|---|
| 1. | Нараджэнне дзіцяці | 1 службовы аклад |
| 2. | Вяселле | 1 службовы аклад |
| 3. | Смерць супрацоўніка або членаў сям'і | 10 мінімальных заробкаў |
| 4. | Дапамога непрацуючым незаможным пенсіянерам | 2 мінімальныя заробкі |
| 5. | Дапамога маці-адзіночкам | 2 мінімальныя заробкі |
| 6. | Дапамога шматдзетным сем'ям (3 і больш дзяцей) | 3 мінімальныя заробкі |
| 7. | Дапамога ў сувязі з доўгай хваробай (больш за 1 месяц) і амбулаторным лячэннем | 1 службовы аклад |

2. Пры стыхійных бедствах і іншых непрадбачаных акалічнасцях аднаразовая дапамога аказваецца, з абгрунтаваннем сітуацыі, па сумеснаму рашэнню рэктарата і прафсаюзнага камітэта.

3. Аднаразовая дапамога, як правіла, аказваецца 1 раз на працягу каляндарнага года.

4. Асабістая заява на матэрыяльную дапамогу, з указаннем прычын, падаецца на імя рэктара і ўзгадняецца з прафкомам.

5. У асобных выпадках рэктар, па ўзгадненню з прафкомам, можа аказваць аднаразовую матэрыяльную дапамогу ветэранам універсітэта і працуючым супрацоўнікам, пры ўзнікненні інфляцыйных працэсаў, росце цэн на тавары першай неабходнасці і паслугі, без іх асабістага звароту.

## ПАМЯТКА

# Небяспечныя "мірныя" рэчывы

За апошнія гады ў краіне назіраецца развіццё розных галін прамысловасці, якія выпрацоўваюць і выкарыстоўваюць у вытворчасці вялікую колькасць атрутных рэчываў моцнага ўздзеяння.

Мінск не з'яўляецца хімічна небяспечным горадам, аднак і ў нас ёсць прадпрыемствы, якія выкарыстоўваюць у вытворчасці атрутныя рэчывы: мясакамбінат, мясаперапрацоўчы завод, гарадскія вадаправодныя станцыі, гарадскія малаказаводы № 1 і № 3, ВА "Крыніца", холадакамбінаты № 1 і № 2 і шэраг іншых невялікіх аб'ектаў.

Найбольш "папулярныя" ў сталічных умовах атрутныя рэчывы: хлор, аміяк, акрылнітрыл, серавуглярод, сінільная кіслата.

У раёне універсітэта знаходзіцца 5 патэнцыяльна небяспечных аб'ектаў, якія выкарыстоўваюць у вытворчай дзейнасці атрутныя рэчывы моцнага ўздзеяння. Ачышчальная вадаправодная станцыя ВА "Мінск-водаканал" выкарыстоўвае ў вытворчым працэсе да 40 тон хлору. На гармалзаводзе № 1 на ўтрыманні знаходзіцца 4,5 тон аміяку. Завод медыцынскіх прэпаратаў выкарыстоўвае ў тэхналагічным працэсе больш за 3 тоны аміяку. Завод эндакрынных прэпаратаў — 9 тон таго ж рэчыва, а "салодкая" "Камунарка" — аж да 10 тон. Падчас узнікнення аварыі на кожным з пералічаных аб'ектаў можа выкідвацца 1 тона хлору і 1-2,5 тоны аміяку. Для чалавека хлор небяспечны тым, што пры яго ўзнікненні магчымы смяротны вынік, пары ўздзейнічаюць вельмі раздражняльна на слізістыя абалонкі і скуру, выклікаюць апёкі слізістай абалонкі дыхальных шляхоў, вачэй, скуры. Аміяк выклікае моцны кашаль, задушша, пары моцна раздражняюць слізістыя абалонкі і скуру, выклікаюць слёзы, судакрананне са скурай выклікае абмаражэнне, сэрцабіццё, парушэнне частаты пульсу, насмарк, цяжкасць дыхання, пачырваненне і сверб скуры, рэзь у вачах, пры ўдыханні вялікіх канцэнтрацый надыходзіць смерць.

Для абароны ад гэтых атрутных рэчываў выкарыстоўваюць грамадзянскі працівагаз, прамысловыя працівагазы, рэспіратары, ахоўныя акуляры, гумавыя пальчаткі, боты, плашчы, ватна-марлевыя павязкі, якія папярэдне змочваюць растворам соды. Каб аказаць пацярпеламу першую дапамогу, яго трэба вынесці на свежае паветра, даць увільготнены кісларод, пры адсутнасці дыхання — зрабіць штучнае метадам "рот у рот". Скуру, слізістыя абалонкі, вочы прамыць вадой ці 2-працэнтным растворам борнай кіслаты на працягу 15 хвілін.

Штабам грамадзянскай абароны Мінска вызначаны наступны парадак апавяшчэння насельніцтва аб экстрэмальнай сітуацыі мірных часоў: кароткачасовае ўключэнне сірэн, завадскіх гудкоў, што азначае сігнал "Увага ўсім!". Па гэтаму сігналу неабходна ўключыць радыётрансляцыйны прыёмнік, тэлевізар, пераключыўшы яго на мясцовую праграму, і праслухаць інфармацыю.

Пачуўшы паведамленне аб аварыі на адным з аб'ектаў народнай гаспадаркі, неабходна хутка апрануць ватна-марлевую павязку і як мага хутчэй пакінуць зону магчымага заражэння. Трэба выходзіць у бок, перпендыкулярны накірунку руху паветра. Для аховы органаў дыхання можна выкарыстоўваць падручныя сродкі з тканін, змочаных у вадзе, футравыя і ватныя часткі адзення. Пасля выхаду з зоны заражэння, людзі, якія атрымалі паражэнні, павінны звярнуцца ў медыцынскія ўстановы.

*Міхаіл ГЕДРЭВІЧ, начальнік штаба грамадзянскай абароны*

## ЗДАРОЎЕ

# Без іглы

У апошнія дзесяцігоддзі наркаманія распаўсюдзілася як эпідэмія па ўсяму свету.

У Беларусі ў 1997 годзе наркаманы сталі асноўнымі носьбітамі невылечнай у наш час інфекцыі — СНІДу. Цяпер выяўлена ўжо каля дзвюх тысяч наркаманаў.

Сярэднестатыстычны наркаман не старэйшы за 25 гадоў. Гандляры наркотыкамі далучаюць да іх нават 10-17-гадовых дзяцей.

Зразумела, наркаманія — гэта хвароба. Усе наркатычныя рэчывы выклікаюць адурманьвальны стан. Далей нарастанне наркатычнай залежнасці прымушае павялічваць дозу і частату прыёму наркотыка, што вядзе да псіхалагічнага і фізічнага знясілення арганізма і да заўчаснай смерці. Людзі, якія прымаюць наркотыкі, па-рознаму ўспрымаюць іх дзеянне — у адных наступае ўзбуджэнне, у іншых затарможанасць. У стане ўзбуджэння наркаману здаецца, што ён поўны энергіі, здольны на творчыя адкрыцці. Хаця гэта толькі ілюзія, гульня ўяўлення, выкліканая ўздзеяннем наркотыка.

Некаторыя наркаманы адчуваюць прыгнечанасць, незразумелы страх, які часам пераходзіць у паніку, альбо іх мучаць жахлівыя прывіды.

Якім чынам узнікае наркатычная залежнасць? Звычайна ў чалавека пасля некалькіх прыёмаў наркотыка развіваецца моцная непераадольная цяга да наркатычнага стану. Гэта і ёсць псіхічная залежнасць. Больш глыбокая — фізічная. Наркотыкі па меры іх ужывання ўваходзяць у хімічны склад тканак арганізма.

У наркамана з фізічнай залежнасцю адсутнасць наркотыка выклікае сіндром адмены: з'яўляецца трывога і страх, які вядзе да адчаю і пачуцця безнадзейнасці, а нярэдка — і да думкі пра самазабойства. Акрамя таго, моцна баліць галава, жывот, паясніца, хворы дрыжыць, яму перашкаджаюць канечнасці.

Усё гэта суправаджаецца сутаргамі, зрокавымі і слухавымі галюцынацыямі. Можа спыніцца дыханне, парушыцца крывезварот.

Ужыванне наркотыкаў заўсёды прыводзіць да незваротнага парушэння жыццядзейнасці арганізма і дэградацыі асобы.

Атручванне арганізма робіцца прычынай хвароб унутраных органаў, асабліва пячонкі і нырак. А выкарыстанне брудных голак і шпрыцоў вядзе да інфекцыйных захворванняў — у тым ліку гепатыту, СНІДу, венерычных.

З медыцынскага пункта гледжання, наркаманія — цяжкае захворванне, а ўсялякую хваробу лягчэй папярэдзіць, чым лячыць. І калі з'яўляюцца нейкія праблемы, лепш падзяліцца імі з блізкімі, роднымі, сябрамі.

*А. А. ФАМІНА, урач 33-й гарадской паліклінікі.*

## СПОРТПЛЯЦОЎКА

# Са штангай па жыцці

Спаборніцтвы па паўэрліфтынгу завяршылі чарговы этап універсітэцкай спартакіяды. У вазе да 52 кг не было роўных Аляксандру Мазаніку з фізфака (сума 285 кг). А Яўген Шаўцоў з юрыдычнага факультэта стаў другім толькі таму, што быў лягчэй за свайго калегу Антона Кельмутца (у абодвух 215 кг).

У вазе да 56 кг першынстваваў Вячаслаў Уласенка (330 кг) з ФПМ. Другі — Дзмітрый Пучкоў з гістфака (280 кг). А радыёфізік Андрэй Лысуха ў апошняй спробе цягі не падняў 137,5 кг і з "сотняй" застаўся толькі трэцім (245 кг).

Не атрымалася барацьбы і ў вазе да 60 кг. Аляксандр Біндзіч з ФПМ — першы (390 кг). І на другім, і трэцім месцах два юрысты. Адпаведна — Павел Кавальчук (330 кг) і Дзяніс Шуклін (280 кг).

А ў вазе 67,5 кг пасля прысядання і ціску лежачы Раман Чаркасаў з ФПМ быў толькі трэцім, праігрываючы лідэру Мікалаю Тарановічу 22,5 кг. Але, падняўшы 210 кг, абыйшоў у станавой вазе ўсіх (445 кг). 7 з паловай кілаграмаў яму прайграў радыёфізік Мікола Тарановіч (437,5 кг). І трэці студэнт РФФ Дзмітрый Кутны (402,5 кг).

У вазе да 75 кг на першую прыступку ўзняўся Дзяніс Семяніда з ФПМ (460 кг), на другую — Аляксандр Бажкоў з фізфака (415 кг), на 10 кг ад яго адстаў таксама фізік Павел Ратнікаў (405 кг). Прычым чацвёртым стаў Аляксей Ратнікаў, брат-блізнец Паўла.

У вазе да 82,5 кг хлопцы спаборнічалі ціха і без сюрпрызаў. Першы — мехматавец Дзмітрый Казлоў (500 кг), другі — Вячаслаў Цянкевіч з радыёфізікаў (405) і трэці — юрыст Максім Маеўскі (370).

Мехматавец Андрэй Карастылёў, які змагаўся за перамогу ў вазе да 90 кг, ужо ў першых спробах прымусіў астатніх забыць пра існаванне першага месца. Узяўшы ў другой спробе ў ціску 150 кг і ў цязе 250 кг, трэція спробы ён нават не выкарыстоўваў. Агульная сума — 615 кг. Другое месца не з такой вялікай сумай, але таксама даволі ўпэўнена заняў Андрэй Журо (440) з геафака. Трэці — Кірыл Рулінскі з ФЭФа (405). Прычым радыёфізік Андрэй Лакуц прайграў яму ўсяго 5 кг (400).

У вазе да 100 кг заваяваў "золата" мехматавец Аляксей Саўчук (530 кг), "срэбра" — Сяргей Астапчук (480) і "бронзу" — Мікола Бароўскі з біяфака (435).

У вазе 110 кг першым стаў фізік Валерый Петух (505), другім — Дзмітрый Заплешнікаў з юрфака (405) і трэцім — Андрэй Атрашкевіч з ФМА (330).

У вазе да 125 кг і звыш таго пераможцы сталі вядомы яшчэ да пачатку спаборніцтваў, бо ў гэтых катэгорыях было толькі па аднаму ўдзельніку. У вазе да 125 кг чэмпіёнам стаў юрыст Аляксей Лапцевіч (300), а звыш 125 кг — Дзмітрый Федаровіч з фізфака (180 кг).

Андрэй Карастылёў выканаў нарматыў кандыдата ў майстры спорту, а Аляксандр Біндзіч, Дзяніс Семяніда, Раман Чаркасаў, Мікола Тарановіч і Дзмітрый Казлоў сталі першаразраднікамі.

У агульным заліку насуперак прагнозам перамог юрыдычны факультэт.

# БДУ няма роўных

У спорткомплексе БДУ 14-15 сакавіка сабраліся 115 мацнейшых студэнтаў-гіравікоў рэспублікі. У вазе да 60 кг першае месца заняў кандыдат у майстры спорту Андрэй Стальмашонак (І курс фізфака). У вазе да 65 кг першым быў кандыдат у майстры спорту Яўген Сясіцкі (І курс юрфака). У вазе 70 кг перамог майстар спорту Дзмітрый Баркан (ІІІ курс ФПМ). Тут жа бронзавы медаль у Вадзіма Праўрацкага ( ІІкурс гістфака). У вазе да 75 кг другое месца — у кандыдата ў майстры спорту Сяргея Гаркушы (І курс фізфака). У вазе да 80 кг на другім месцы майстар спорту Алег Шчур (ІІІ курс фізфака). У вазе да 90 кг не было роўных майстру спорту Аляксандру Ваўку (І курс юрфака). У вазе да 100 кг абагнаў усіх канкурэнтаў Алег Сямёнаў (V курс гістфака). І ў гэтай жа катэгорыі срэбра ў Дзмітрыя Заплешнікава (ІІ курс юрфака). Каманда БДУ заняла першае агульнакаманднае месца. Узнагароджанне праводзілі дэканы Аляксандр Віктаравіч Шарапа (факультэт міжнародных адносін) і Віктар Міхайлавіч Анішчык (фізічны факультэт).

*Выпуск падрыхтавала Вольга КАЗДЗЕРКА*

## ШУКАЮ ПРАЦУ!

# Ветлівасць. І пажадана без авангарду

Шмат хто з сучасных студэнтаў не супраць у вольную ад навучання гадзіну падпрацаваць.

Некаторыя шукаюць месца самі, некаторыя ідуць у цэнтр занятасці. Сёння па адрасу Якуба Коласа, 69 існуе база дадзеных цэнтра, дзе можна з дапамогай камп'ютэра даведацца, якія вакансіі прапануюцца ў дадзены момант на рынку працы.

Выбраць прафесію на свой густ — яшчэ не азначае атрымаць працу. Самае галоўнае — зрабіць добрае ўражанне на працадаўцу, спадабацца настолькі, каб цябе захацелі бачыць на прадпрыемстве.

Адна з галоўных памылак моладзі — завышаная самаацэнка: "Я незвычайна разумны чалавек. Вам пашанцавала, што я сюды прыйшоў." На самой справе, спецыялістаў, што не маюць вопыту, бяруць з вялікай неахвотай. І, як паказвае практыка, маладому чалавеку давядзецца абысці 20 месцаў перад тым, як ён атрымае станоўчы адказ. Таму з самага пачатку неабходна быць падрыхтаваным да адмовы. У той жа час, не трэба загадзя папярэджваць працадаўцу словамі кшталту: "Я, канешне, не маю вопыту, яшчэ малады і ўвогуле...". Для кагосьці гэта не мае значэння, а вашыя "самапрыніжэнні" толькі непрыемна ўразяць.

Як вядома, маладосць — гэта той недахоп, які з часам праходзіць, а пакуль ён у вас усё ж такі ёсць, суцяшайцеся шэрагам іншых сваіх вартасцяў: "Ну і што, што малады, затое — прыгажун, неабцяжараны сям'ёй, дзецьмі, лёгка вучуся..." і г.д. У рэшце рэшт, кожная катэгорыя людзей мае аб'ектыўныя прычыны, каб ёй адмовіць. Важна паказаць працадаўцам, што, акрамя адсутнасці вопыту, недахопаў у вас няма. Дасягнуць гэтага можна наступным чынам.

Першым крокам да поспеху з'яўляецца знешні выгляд: ахайная вопратка, памытыя валасы, чыстыя пазногці, наваксаваны абутак — усё гэта робіць станоўчае ўражанне пры ацэнцы вашай асобы.

Дарэчы, варты жалю знешні выгляд стаіць на першым месцы ў шэрагу прычын, па якіх людзям адмаўляюць у працы. (А 25-е займае неахайнасць.)

Асабліва трэба звярнуць на сябе ўвагу аматарам авангарднай моды. Стэрэатып добрага работніка існуе: гэта сур'ёзны чалавек, адным з паказчыкаў якога з'яўляецца салідны касцюм. Ультрамодныя рэчы могуць стаць прычынай адмовы пры ўладкаванні на працу. Ёсць, канешне, і сярод начальнікаў выключэнні, аднак лепш не рызыкаваць.

Даволі часта прэтэндэнтам прапаноўваецца анкета. Да гэтага трэба ставіцца сур'ёзна. Яна не павінна быць безаблічнай. Шэрая, пасіўная інфармацыя тут не падыходзіць. Калі яна будзе перадаваць вашую асабістую энергію і жаданне працаваць, то гэта дасць вам шанец стварыць аб сабе станоўчае меркаванне. Не забываючыся, канешне, на праўду.

Важнымі пры субяседванні з'яўляюцца натуральныя паводзіны, праўдзівасць і ўпэўненасць у сабе.

Тут трэба адзначыць, што яшчэ дамаўляючыся аб асабістай сустрэчы па тэлефоне, вы ствараеце першае ўражанне аб сабе. Для таго, каб яно было станоўчым, не трэба імкнуцца вырашыць усе пытанні па тэлефоне. Галоўнае дамовіцца аб асабістай сустрэчы, якая дасць магчымасць атрымаць больш аб'ектыўную інфармацыю і пакідае больш месца для творчасці ў самапрэзентацыі.

Размаўляючы па тэлефоне, лепш быць лаканічным.

Узаемныя прывітанні і знаёмства — 0,5 хвіл.;

увядзенне суразмоўцы ў курс справы, інфармаванне аб мэце тэлефанавання — 1 хвіл.;

дасягненне мэты размовы, г.зн. дамова аб сустрэчы — 2-4 хвіл.;

заканчэнне размовы, развітанне — 0,5 хвіл.

Павага да суразмоўцы і яго працоўнага часу амаль заўсёды пакідае добрае ўражанне.

Ведайце, што рашэнне аб тым, браць вас на працу ці не, складаецца ў першыя 5-7 хвілін сустрэчы.

Каб выкарыстаць гэта, трэба звярнуць увагу на тое, як вы заходзіце, як гучыць ваш голас, што выражае твар. Тут дробязяў няма. Спакой, павага, добразычлівасць у размове, натуральныя паводзіны — вось эталон.

У працэсе размовы не трэба саромецца паказаць свае моцныя і лепшыя бакі як работніка, так і чалавека. Не трэба даваць сабе ацэнак і хваліць сябе галаслоўна.

Галоўным для поспеху з'яўляецца ўменне выклікаць давер у слухача, паўстаць перад ім кампетэнтным, сумленным, энергічным, прымаць блізка да сэрца яго праблемы і клопаты, жадаць і магчы гэтыя праблемы вырашыць.

Не забудзьцеся, скончаючы размову, дамовіцца аб тым, калі і як вы даведаецеся аб выніках. Пажадана, каб ініцыятыва засталася за вамі: лепш дамовіцца, што вы будзеце тэлефанаваць у прызначаны вам час, а не чакаць тэлефанавання.

Развітваючыся, падзякуйце суразмоўцу за гутарку і праяўленую ўвагу.

Напрыканцы хочам дадаць: памятайце аб залатой сярэдзіне. Прычынамі адмовы бываюць як манеры ўсязнайкі, так і нерашучасць, як адсутнасць інтарэсу і энтузіязму, так і залішні ціск. Гэта можа быць ваша няўменне размаўляць: слабы голас, дрэнная дыкцыя і граматычныя памылкі; адсутнасць плана кар'еры і дакладных мэт і задач; недахоп шчырасці і раўнавагі...

У кожным выпадку памятайце пра ветлівасць, выхаванасць і такт. Такія рэчы дапамагаюць трымаць марку.

*Валерыя АЎСЯНІК*


**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Заснавальнік газеты - БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.

Газета надрукавана на паліграфічнай фабрыцы "Чырвоная зорка" ВПП імя Я. Коласа. 220079, г. Мінск, 1-ы Загарадны завул., 3
Ум. друк. арк. 1
Падпісана ў друк у 12.00

26 САКАВІКА
Зак. 1433
Т. 1000 экз.
Бясплатна



Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 9, паверх 4, пакой 411, тэлефон 2206827.



Рэдактар М. Г. ЗАГОРСКАЯ

Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Камп'ютэрная вёрстка Крывадубскай А.